# ПОЧЫРК ЧЫРВОНАГА КАМІСАРА

*Да 70-годдзя з дня нараджэння І. А. АДАМОВІЧА*

Адным з вядомых дзяржаўных, партыйных і ваенных дзеячоў Беларусі быў Іосіф Аляксандравіч Адамовіч. Нарадзіўся ён 26 снежня 1896 года ў Барысаве. Жыццё шматдзетнай сям'і было цяжкае. І пасля заканчэння царкоўна-прыходскай школы Іосіфу давялося пачынаць працоўнае жыццё, каб дапамагаць бацькам зарабляць на хлеб. Спачатку ён працаваў разам з бацькам і старэйшым братам падсобным рабочым на фабрыцы глінянага посуду, затым наняўся на запалкавую фабрыку «Бярэзіна»...

Ішла імперыялістычная вайна, цару патрэбны былі салдаты. Чарга дайшла і да Іосіфа Адамовіча. Прызыўная камісія накіравала яго служыць у Царскасельскі запасны лейб-гвардзейскі полк. Тут ён стаў унтэр-афіцэрам. У канцы 1915 года І. Адамовіч з маршавай ротай адпраўлен у дзеючую армію, на Паўднёва-Заходні фронт. Тут, на фронце, малады Адамовіч уключаецца ў палітычнае жыццё, прымае ўдзел у рабоце рэвалюцыйнага гуртка, уступае ў пал-

У снежні 1917 года Адамовіч быў звольнены ў запас і прыбыў у Барысаў. Тут ён уключыўся ў работу па ўстанаўленню Савецкай улады, быў выбраны сакратаром Барысаўскага павятовага выканкома Саветаў. У студзені 1918 года прыняты ў рады РСДРП(б). З гэтага часу ўсё жыццё І. А. Адамовіча было звязана з Камуністычнай партыяй.

У дні наступлення нямецкіх войск разам з групай барысаўскіх рабочых Адамовіч эвакуіруецца ў Смаленск, дзе ўступае добраахвотнікам у рады Чырвонай Арміі. Камандаванне даручыла яму сфарміраваць 1-ю Смаленскую батарэю. І ён з вялікай энергіяй узяўся за даручаную справу. І. Адамовіч часта бываў на прадпрыемствах, на чыгуначным вакзале, дзе збіралася вялікая колькасць дэмабілізаваных салдат. Гутарыў з рабочымі, былымі ваеннаслужачымі, клікаў іх уступаць у Чырвоную Армію. Агітаваць ён умеў, валодаў здзіўляючай сілай пераканання.



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

товым камісарам па ваенных справах.

губеранскім ваенным камісарам, вядзе вялікую работу па ўмацаванню тылу, узначальвае атрады па барацьбе з контррэвалюцыйнымі выступленнямі (мяцеж Стракапытава ў Гомелі, кулацкія банды ў Смаленскай губерні). У жніўні 1919 года, калі ўскладнілася становішча на Заходнім фронце, Адамовіч быў накіраваны начальнікам гарнізона і абароны Аршанскага раёна. У кастрычніку быў адкліканы ў Смаленск і працаваў Смаленскім губваенкомам і начальнікам гарнізона Смаленска.

У 1920 годзе І. А. Адамовіч працягвае весці ваенную работу ў Смаленску, кіруе фарміраваннем часцей і падраздзяленняў Чырвонай Арміі. Калі пачалося вызваленне Беларусі ад белапалякаў, ён адклікаецца на работу ў Мінск. Адамовіч назначаецца членам Мінскага губеранскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта. Разам з А. Г. Чарвяковым і В. Г. Кнорыным вядзе кіпучую дзейнасць па аднаўленню Савецкай улады ў вызваленых раёнах Беларусі, арганізоўвае мясцовыя рэўкомы, партыйна-арганізацыйныя тройкі. Будучы Мінскім губеранскім ваенным камісарам, кіруе мабілізацыяй рабочых і працоўных сялян вызваленых паветаў у рады Чырвонай Арміі.

II з'ездзе Саветаў Беларусі выбран членам ЦВК БССР. На першай сесіі ЦВК БССР 2-га склікання выбіраецца членам Прэзідыума ЦВК і назначаецца народным камісарам па ваенных справах рэспублікі.

І. А. Адамовіч праводзіць вялікую работу па нацыянальна-дзяржаўнаму будаўніцтву. У студзені 1921 г. па даручэнню ЦК КПБ і ўрада рэспублікі вёў перагаворы з урадам РСФСР, якія завяршыліся 16 студзеня 1921 г. падпісаннем «Саюзнага рабоча-сялянскага дагавору» паміж БССР і РСФСР, згодна з якім рэспублікі ўступалі ў гаспадарчы і ваенны саюз, што мела важнае значэнне для паспяховага аднаўлення народнай гаспадаркі Савецкай Беларусі. Ад БССР дагавор падпісаў І. А. Адамовіч.

З сакавіка 1924 г. І. Адамовіч — Старшыня Саўнаркома БССР. Ён быў таксама выбраны членам бюро ЦК КПБ. З'яўляючыся кіраўніком Савецкага ўрада рэспублікі, ён цалкам аддаецца рабоце, уваходзіць ва ўсе сферы жыцця народа — гаспадарчае будаўніцтва, культуру, навуку, літаратуру і мастацтва.

З 1927 года І. Адамовіч — на гаспадарчай рабоце. Куды б ні накіроўвалі яго партыя і ўрад, ён усюды з гонарам выконваў любое заданне. Загінуў І. А. Адамовіч 22 красавіка 1937 года.

С полным текстом документа можно ознакомиться в библиотеке